

У Год гістарычнай памяці да мемарыяльнага комплексу «Памяць» ганаровыя госці ўсклалі кветкі



На галоўнай сцэне пераможцы літаратурных конкурсаў атрымалі дыпломы і прэміі

# Дзень беларускага пісьменства ў Добрушы прайшоў з размахам

## Літаратурнае свята разгарнулася на шматлікіх і вельмі цікавых пляцоўках. Было на што паглядзець і чаму здзівіцца!

### ДЗЕНЬ ПЕРШЫ

#### ДЗЕ СВЕЖЫЯ НАВІНЫ? ТУТ!

Гасцей сустракаў фестываль кнігі і прэсы. Вуліца князя Фёдара Паскевіча знаёміла з творчай лабараторыяй журналістаў, паліграфістаў, выдаўцоў, распаўсюджвальнікаў друку. Побач размясціўся газетны бульвар, дзе ўдзельнікі маглі зрабіць сэлфі з друкарскімі станкамі розных гадоў, намаляваць мультфільм з Купалай і Коласам, аператыўна напісаць навіну. Кожнае выданне падрыхтавала для гасцей і чытачоў свае цікавыя навінкі. У павільёне «Гомельскай праўды» для гасцей адкрылі выставу пад адкрытым небам з фотаздымкамі вобласці з дрона.

#### ЛЮСТЭРКА ГІСТОРЫІ

Музей гісторыі друку і фатаграфіі адлюстраваў лёс газетнай справы Гомельшчыны з XX стагоддзя. Музей палацава-паркавага ансамбля прадставіў рарытэт – Усходні рукапіс на арабскай мове «Фетавай» 1655 года выдання. Літаратурныя музеі Якуба Коласа і Янкі Купалы правялі экскурс па творчасці песняроў зямлі беларускай.

Свята праходзіла таксама на бібліятэчным бульвары. Нацыянальная бібліятэка Беларусі прэзентавала праект «Дыяменты стагоддзя», які быў прысвечаны яе 100-годдзю.

Фестываль літаратуры ў Добрушы праходзіў у Год гістарычнай памяці. Таму на Дні пісьменства прыехала мабільная выстава Беларускага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны, а набярэжная ракі Іпуцьператварылася ў мемарыяльную пляцоўку. Гасцям свята паказалі, якімі былі Добруш і Гомельшчына ў 40-я гады мінулага стагоддзя. Акупацыя, барацьба мірнага насельніцтва і партызан, сустрэча Перамогі – усё гэта ўбачылі гледачы.

#### З ЛЮБОЎЮ ДА РАДЗІМЫ

Майстры народных мастацкіх рамёстваў Гомельшчыны прывезлі на свята лепшыя вырабы. Маладзёжная пляцоўка прапанавала віктарыны, конкурсы і самыя розныя гульні для падлеткаў і студэнтаў. Свой погляд на райцэнтр паказалі вучні і выкладчыкі Гомельскага дзяржаўнага мастацкага каледжа, на малюнках і габеленах – краявіды Добруша, знаёмыя ўсім, і выдатныя мясціны горада. Да літаратурных дажынак адкрылі таксама персанальную выставу Уладзіміра Пракапцова «Мая Беларусь».

#### ГУЛЯЦЬ ДАЗВАЛЯЕЦЦА

На стадыёне праходзіў першы фестываль футбола памяці Уладзіміра Рыжанкова – ураджэнца Добруша, першага міністра спорта і турызму Беларусі, які ўнёс значны ўклад у развіццё фізічнай культуры і спорту, а таксама ў алімпійскі рух краіны. Удзел у фестывалі прымалі 40 каманд Гомельшчыны, а таксама восем з чатырох рэгіёнаў Расіі. Першы намеснік главы Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў адзначыў, што ён заўсёды вельмі рады наведаць Добрушскую зямлю.

– Фестываль у тым ліку замацоўвае беларуска-расійскае спартыўнае братэрства, – зазначыў Максім Рыжанкоў, – і ніхто не зможа забараніць нам гуляць у футбол.

Памочнік Прэзідэнта – інспектар па Гомельскай вобласці Мікалай Рагашчук працягвае гэту думку: ніхто не забароніць нам сяброўства.

Літаратары падрыхтавалі для пераможцаў спецыяльны прыз: футбольны мяч з подпісамі беларускіх пісьменнікаў.

#### КУТОК ПЕСНЯРОЎ БЕЛАРУСІ

Увечары ганаровыя госці ўсклалі кветкі да мемарыяльнага комплексу «Памяць». Пасля адбылася цырымонія адкрыцця помніка Івану Шамякіну і гашэння памятнага канверта з арыгінальнай маркай, прысвечанай XXIX Дню беларускага пісьменства.

Намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка падзяліўся ўражаннямі ад свята. Ён адзначыў, што вельмі актыўны ўдзел у ім прымала пісьменніцкая суполка. Ёсць інтарэс да літаратурнай творчасці і ў моладзі. Гэта сведчыць, што ёсць сувязь пакаленняў, і яна перадаецца далей. Госці з інтарэсам наведвалі знакавыя месцы, бо было што пабачыць. Горад змяніўся да свята, і гэта дазволіла арганізаваць тут камфортную, утульную і цёплую атмасферу. Ігар Петрышэнка выказаў падзяку жыхарам Добруша за тое, што яны адгукнуліся і сумесна з уладамі прывялі горад у цудоўны стан, і гэта, безумоўна, будзе прыцягваць сюды турыстаў яшчэ доўгі час.

#### ВЕЧНЫ КАЛЯНДАР ПАМЯЦІ

Даты, постаці і падзеі мінулага, сучаснага і будучага беларускага пісьменства і культуры ажылі на галоўнай сцэне Добруша, дзе адбылося ўрачыстае адкрыццё. Госці ўзгадалі творы легендарных паэтаў Беларусі і сучасных аўтараў. Лейтматывам сталі важныя чалавечыя і хрысціянскія каштоўнасці беларусаў. І, канешне, паданні Добруша – сталіцы паперы і фарфора, беларускай Венецыі, малой радзімы славутых землякоў. Жыхароў рэгіёна павіншаваў старшыня аблвыканкама Іван Крупко:

– Свята набывае асаблівае гучанне ў Год гістарычнай памяці, калі мы звяртаемся праз карані свае і магутныя духоўныя крыніцы да замацавання адзінства беларускага народа.

Цікавых знаёмстваў і нечаканых адкрыццяў пажадаў удзельнікам свята міністр інфармацыі Уладзімір Пярцоў. Благаславенне ўдзельнікі атрымалі ад мітрапаліта Мінскага і Заслаўскага Веніяміна, Патрыяршага экзарха ўсяе Беларусі.

Пераможцы Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі – 2022 атрымалі ўзнагароды падчас адкрыцця.

Суправаджаў праграму Прэзідэнцкі аркестр Беларусі пад кіраўніцтвам галоўнага дырыжора Віталя Кульбакова. Сапраўдным сюрпрызам стала сустрэча з героямі тэлепраграмы «Калыханка», выступленне калектываў «Бяседа», «Беларусы», Алёны Ланской, Ірыны Дарафеевай, гурта «Дразды» і Анатоля Ярмоленкі. Першы дзень беларускага пісьменства завяршылі гімн свята і яскравы феерверк.

### ДЗЕНЬ ДРУГІ

#### З МАЛІТВАЙ І ТВОРЧЫМ СЛОВАМ

Пачаўся другі дзень у добрушскім храме Свяціцеля Мікалая Цудатворцы, дзе адбылася святочная служба і запальванне Святога Агню ад Гроба Гасподняга. Агонь даставілі ўдзельнікі экспедыцыі «Дарога да Святыняў».

На галоўнай сцэне прадстаўнікі Саюза пісьменнікаў краіны сваімі творамі прызналіся ў любві да роднай зямлі. Старшыня абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзімір Гаўрыловіч прэзентаваў кнігу «Па веры вашай...». На літаратурным фестывалі ва ўсіх школах Добруша пісьменнікі з Беларусі і Расіі сустрэліся з маладымі чытачамі. Паслухаць таленавітых землякоў можна было на праспекце Міра, дзе адбылося свята духавых аркестраў.

#### ГЕРОІ НАШАГА ЧАСУ

У Дзень беларускага пісьменства агучылі імёны пераможцаў абласной літаратурнай прэміі імя Кірілы Тураўскага. Іх творы добрыя і павучальныя, з гумарам і філасофіяй, прасякнуты любоўю да Радзімы і павагай да гісторыі і продкаў.

– Прыемна, што такія сустрэчы славянскіх пісьменнікаў адбываюцца на Гомельшчыне штогод. Сёння яны асабліва важныя, бо мастацкае слова як ніколі раней абараняе дзяржаўную бяспеку ў духоўнай сферы, – адзначыў старшыня аблвыканкама Іван Крупко.

Узнагароды ўручылі лепшым удзельнікам конкурсу «Золотое перо «Белой Руси» – 2022», пераможцам Рэспубліканскага творчага конкурсу «Хвала рукам, что пахнут хлебом».

#### ДА СУСТРЭЧЫ, СЯБРЫ!

На Добрушчыне ў гэтыя дні пабывалі госці з розных куткоў Беларусі і іншых краін. Па традыцыі на цырымоніі закрыцця адбылася перадача эстафеты свята яго будучай сталіцы – Гарадку Віцебскай вобласці. Яно пройдзе ў вельмі прыгожым горадзе, дзе быў напісаны знакаміты твор «Тарас на Парнасе». Фінальную творчую атмасферу стварыў харэаграфічны пралог, які прадставіў узорны ансамбль танца «Дружба». А галоўным музычным падарункам стаў канцэрт народнага артыста Беларусі Анатоля Ярмоленкі і калектыва «Сябры».

*(Працяг на стар. 6–8)*